## НАШЕ НАСЛЕДИЕ

С.Я. Новікаў

# ЛЯ ВЫТОКАЎ СТВАРЭННЯ МІНСКАГА МДЛУ

В статье показаны истоки возникновения одного из высших учебных заведений нашей страны – Минского государственного педагогического института иностранных языков (МГПИИЯ), надежный фундамент которого был заложен первым ди(ректором) М.Ф. Жавридом. С его именем связаны многие достижения вуза в развитии материально-технической базы, в становлении и усовершенствовании учебно-воспитательного процесса, научно-исследовательской работы преподавателей и студентов, превращения института в ведущий центр в отрасли зарубежной филологии. Автор впервые предлагает читателю материал, составляющий основу историко-культурного наследия МГЛУ.



Мінскі дзяржаўны педагагічны інстытут замежных моў (МДПІЗМ) мае багатую гісторыю, якая пачынаецца ў пасляваенным 1948 годзе, калі ён быў заснаваны на базе факультэта замежных моў Мінскага педагагічнага інстытута імя М. Горкага. Ля вытокаў яго ўзнікнення стаяў першы ды(рэктар) Міхаіл Фядотавіч Жаўрыд [1, арк. 81]. За 13 гадоў яго працоўнай дзейнасці на гэтай пасадзе быў закладзены трывалы падмурак для лінгвістычнай адукацыі ў краіне.

Сваю педагагічную дзейнасць М.Ф. Жаўрыд пачаў у сярэдзіне 1920-х гадоў. У 1932 г. ён закончыў Мінскі педагагічны інстытут. Працаваць па спецыяльнасці пачаў з 1934 г.; перад Вялікай Айчыннай вайной навучаўся ў аспірантуры на кафедры эканамічнай геаграфіі БДУ; з 1940 г. працаваў намеснікам дэкана геаграфічнага факультэта. З пачаткам Вялікай Айчыннай вайны быў прызваны на дзеючую службу ў Чырвоную армію, але не служыў па стане здароўя. У час абароны Масквы ўдзельнічаў у правядзенні інжынерных работ па будаўніцтве ўмацаванняў [2].

У 1944 г. ўступіў у партыю. У тым жа годзе пасля вызвалення Мазыра ўзначаліў настаўніцкі інстытут. Паводле загада СНК БССР ад 29 ліпеня 1944 г. – дырэктар Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. Горкага.У маі 1945 г. прызначаны намеснікам наркома асветы БССР [3, с. 33], працягваючы працу па сумяшчальніцтве загадчыкам кафедры прыродазнаўства і геаграфіі пядінстытута да канца 1947 г. З лютага па май 1948 г. знаходзіўся ў трохмесячнай камандзіроўцы па напісанні дысертацыі. На пасаду ды(рэктара) МДПІЗМ быў рэкамендаваны ЦК КП(б)Б [1, арк. 7].

Інстытут быў створаны ў адпаведнасці з Пастановай СМ СССР № 3485 ад 4 кастрычніка 1947 г. У рамках яе выканання на ўзроўні ўрада БССР прымаюцца пастанова СМ БССР № 1686 ад 26 лістапада 1947 г. і загад МА БССР № 199 ад 25 жніўня 1948 г. [3, арк. 66], згодна якім быў створаны

Інстытут замежных моў. Як самастойная ВНУ ён пачаў функцыянаваць з 1 верасня 1948 г. ў складзе трох факультэтаў – англійскай, нямецкай і французскай моў і 8 кафедраў. У адпаведнасці з загадам Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР № 476 ад 21 красавіка 1949 г. і Міністэрства асветы БССР № 68 ад 29 красавіка 1949 г., у інстытуце адкрыта завочнае аддзяленне [4, арк. 100].

У інстытуце быў арганізаваны Савет і створаны неабходныя структурныя падраздзяленні – рэктарат, вучэбная частка, навуковая частка, аддзел кадраў, бухгалтэрыя, канцылярыя, аддзел забеспячэння, гаспадарчая частка, бібліятэка [5, арк. 265–284; 6, арк. 270]. Кіраўніцтва факультэтамі ажыццяўлялася двума дэканатамі факультэтаў англійскай і нямецкай моў. Факультэт французскай мовы ў сувязі са сваёй малалікасцю не меў дэканата, таму кіраўніцтва вялося дэканам англійскай мовы [7, арк. 1].

У першы 1948–1949 навучальны год заняткі ў інстытуце праходзілі ў другую змену ў будынку школы № 13 (вул. Пушкіна, д. 35) разам са студэнтамі МДПІ імя М. Горкага. Вучэбна-вытворчая база інстытута была абмежаванай, таму ўвесь час прыходзілася працаваць у надзвычай цяжкіх умовах [5, арк. 1–2]. Амаль 10 гадоў спатрэбілася інстытуту для стварэння ўласнай матэрыяльна-тэхнічнай базы. Спачатку студэнты факультэта нямецкай мовы вучыліся ў інтэрнаце, уведзеным у эксплуатацыю па Омскім завулку 1 верасня 1955 г. [6, арк. 4]. Заняткі ішлі ў іншых школах горада, у адным з будынкаў БПІ (праспект Сталіна, 79). Затым у 1957–1958 вучэбным годзе інстытут размяшчаўся ў будынку былога педагагічнага вучылішча па вуліцы Захарава, 59, дзе часова арэндаваў два паверхі (першы паверх займала Рэспубліканская школа павышэння кваліфікацыі настаўнікаў). У чэрвені 1958 г. прымаецца ў эксплуатацыю першы (галоўны) корпус інстытута на вуліцы Захарава. У ліпені 1958 г. інстытут перайшоў на новыя вучэбныя і адміністрацыйныя плошчы. Аднак адразу ж стала відавочным, што аўдыторнага фонду для заняткаў не хапала, таму яны праводзіліся ў дзве змены. У новым корпусе інстытута не было чытальнай залы і бібліятэкі, фонд якой на той момант складаў 165 тысяч адзінак кніг (129 500) і часопісаў (у 1948 г. ў фондах бібліятэкі было толькі 3855 экземпляраў, перададзеных бібліятэкай МДПІ імя Горкага) [5, арк. 48].

З першага навучальнага года кіраўніцтва інстытута бачыла важнымі задачамі сваёй дзейнасці падрыхтоўку высокаадукаваных спецыялістаў па замежных мовах (настаўнікаў сярэдніх школ, выкладчыкаў вышэйшых і сярэдніх навучальных устаноў, рэферэнтаў, перакладчыкаў для работы ў розных установах); выкананне навукова-даследчых работ у вобласці філалогіі, педагогікі, псіхалогіі, гісторыі КПСС, палітэканоміі, філасофіі; стварэнне падручнікаў і вучэбна-метадычных дапаможнікаў; фарміраванне навукова-педагагічных кадраў; павышэнне кваліфікацыі спецыялістаў па замежных мовах, якія працуюць у сістэме народнай адукацыі і г.д. Развіццё інстытута звязвалі і з арганізацыяй сістэматычных, планавых камандзіровак навуковых работнікаў у Маскву і Ленінград з мэтай павышэння тэарэтычнага і метадычнага ўзроўню, авалодвання вопытам лепшых інстытутаў Савецкага Саюза [5, арк. 64–65].

На 1948–49 вучэбны год Міністэрствам вышэйшай адукацыі СССР для інстытута быў зацверджаны штат у 47 адзінак прафесарска-выкладчыцкага складу [5, арк. 3–4]. Як адзначалася ў справаздачы аб рабоце інстытута за першы навучальны год, з 5 кафедраў інстытута толькі 2 узначальвалі кандыдаты навук, тады як астатнія – старшыя выкладчыкі, пры гэтым па замежных мовах інстытут не валодаў навуковымі супрацоўнікамі, якія б мелі вучоную ступень і вучонае званне.

Нягледзячы на празмерныя цяжкасці ў арганізацыі і забеспячэнні вучэбнага працэсу, першы навучальны год у інстытуце прынёс пэўныя станоўчыя вынікі. На 1 курс у 1948 г. былі залічаны 158 студэнтаў, у тым ліку на факультэт англійскай мовы – 88, на факультэт нямецкай мовы – 40 і на факультэт французскай мовы – 40. Усяго ў інстытуце на пачатак вучэбнага года навучалася 408 студэнтаў, а на канец года – 364 [5, арк. 6], з якіх на факультэце англійскай мовы – 204 студэнты, на факультэце нямецкай мовы – 86 і на факультэце французскай мовы – 74. У чэрвені 1949 г. адбыўся першы выпуск спецыялістаў па замежных мовах у колькасці 43 чалавек, з якіх выкладчыкаў англійскай мовы – 24, нямецкай – 9 і французскай – 10. Чатыры выпускнікі былі пакінуты для работы ў інстытуце ў якасці асістэнтаў [5, арк. 7]. На працягу першых 10 гадоў колькасць студэнтаў павялічылася больш чым удвая. Так, на 30 чэрвеня 1957 г. на чатырох курсах інстытута навучаліся 849 студэнтаў, з іх на 1 курсе – 161, на 2 – 169, на 3 – 278 і на 4 – 241. Па колькасці студэнтаў самым вялікім з'яўляўся факультэт нямецкай мовы, дзе навучалася амаль палова ўсіх студэнтаў – 417. Звыш трэці складалі студэнты факультэта англійскай мовы. На факультэце французскай мовы навучаліся 124 студэнты [7, арк. 16].

Вучэбны працэс у інстытуце ў першы год яго існавання забяспечвалі кафедры: *асноў марскізму-ленінізму* ў складзе 6 выкладчыкаў (загадваў кафедрай дацэнт Ф.Р. Міхалап); *англійскай мовы* ў складзе 13 выкладчыкаў (загадчык – старшы выкладчык А.П. Шлопак, які выконваў таксама абавязкі намесніка дырэктара па навуковай і вучэбнай рабоце; старшы выкладчык А.С. Марціросава выконвала яшчэ і абавязкі дэкана факультэта англійскай мовы); *нямецкай мовы* ў складзе 8 выкладчыкаў (абавязкі загадчыка кафедры выконвала Ф.Б. Столава; старшы выкладчык М.Р. Эрэнштэйн з'яўляўся дэканам факультэта; *французскай* мовы ў складзе 9 выкладчыкаў (абавязкі загадчыка кафедры і дэкана факультэта выконвала І.І. Таміліна); *педагогікі* ў складзе 4 выкладчыкаў (загадчык кафедры – дацэнт П.П. Дзема); *літаратуры* ў складзе 3 выкладчыкаў (загадчык кафедры – дацэнт У.С. Лазавецкі); *мовазнаўства* ў складзе 2 выкладчыкаў; *фізічнага выхавання* ў складзе старшага выкладчыка і лабаранта [5, арк. 48]. На 1 верасня 1958 г. у інстытуце працавалі 129 выкладчыкаў прафесарска-выкладчыцкага складу, у тым ліку 107 штатных супрацоўнікаў. Пры гэтым на кафедрах замежных моў былі толькі 6 спецыялістаў з вучонымі званнямі і ступенямі (П.А. Гарэлік, З.Н. Левіт, Т.К. Рушава, Н.К. Салаўёва, В.І. Тур, Н.А. Чэкмазава) [8, арк. 5].

З першага года існавання інстытута кіраўніцтва звязвала яго развіццё з выкананнем планаў па навукова-даследчай рабоце. Піянерамі ў працы над дысертацыямі ў інстытуце былі старшыя выкладчыкі Н.К. Салаўёва (кафедра англійскай мовы), Д.С. Берман (кафедра нямецкай мовы) і Ф.Б. Столава

(кафедра нямецкай мовы) [5, арк. 60] і М.Ф. Жаўрыд (кафедра палітэканоміі). У красавіку 1954 г. Міхаіл Фядотавіч паспяхова абараніў кандыдацкую дысертацыю, у 1956 г. атрымаў вучонае званне дацэнта [1, арк. 50]. Вынікі даследавання дайшлі да шырокай чытацкай аўдыторыі ў манаграфіі "Белорусское стекло" (Мінск, 1965).

З 1 верасня 1956 г. інстытут перайшоў на 5-гадовы тэрмін навучання. У юбілейным 1958 г. быў праведзены першы выпуск студэнтаў, падрыхтаваных па дзвюх спецыяльнасцях: замежная мова і руская мова і літаратура; беларуская мова і літаратура [8, арк. 5].

М.Ф. Жаўрыд апрача ўсяго праводзіў значную грамадскую работу – з'яўляўся членам парткама інстытута, Варашылаўскага райкама КП(б)Б г. Мінска, дэпутатам Фрунзенскага раённага Савета дэпутатаў працоўных і дэпутатам гарадскога Савета дэпутатаў працоўных [1, арк. 61].

Той перыяд жыцця бацькі М.Ф. Жаўрыда добра памятае малодшы сын – Аляксей. У яго засталіся яркія ўспаміны пра тое, як да бацькоў прыходзілі вядомыя педагогі, як ішло абмеркаванне пытанняў жыцця інстытута, як бацька браў яго разам з сабой на пошук пляцоўкі пад будучыя карпусы, як яму ў распрацоўцы архітэктурных праектаў першых карпусоў інстытута актыўна дапамагаў вядомы архітэктар Г.У. Заборскі і інш. [2].

На думку сына, важнай крыніцай паспяховай працы М.Ф. Жаўрыда ў інстытуце з'яўлялася яго сям'я. Разам з жонкай В.В. Платонавай, якая працавала настаўніцай хіміі ў школе і тэхнікуме, яны выгадавалі 4 дзяцей, у тым ліку: старэйшага Вілена, які ў 28 гадоў стаў кандыдатам медыцынскіх навук, дацэнтам, працаваў загадчыкам тэрапеўтычнага аддзялення 1-й гарадской бальніцы г. Мінска; другі сын Леанід атрымаў спачатку адукацыю па спецыяльнасці "Энергетыка", потым стаў спецыялістам у галіне вылічальнай тэхнікі, пасля чаго працаваў у АН БССР і МУС БССР; трэці сын Аляксей пачынаў навучанне на механічным факультэце БПІ, а завяршыў – у Маскоўскім вышэйшым тэхнічным вучылішчы імя Н.Э. Баўмана па спецыяльнасці "Прыборабудаўніцтва", кандыдат тэхнічных навук і да гэтага часу працуе начальнікам упраўлення ў Навукова-даследчым інстытуце ЭВМ у Мінску; дачка Таццяна пасля заканчэння кансерваторыі шмат гадоў працавала яе выкладчыкам. Апрача таго, атрымала адукацыю ў МДПІЗМ, пасля чаго выкладала англійскую мову ў БПІ. У бацькоў выраслі 7 унукаў і 10 праўнукаў, усе яны – мінчане [2].

Такую незабыўную спадчыну пакінуў нашчадкам М.Ф. Жаўрыд – першы ды(рэктар) Мінскага МДЛУ

ЛІТАРАТУРА

1. Справа Жаўрыда Міхаіла Фядотавіча // Архіў Мінскага дзяржаўнага лінгвістычнага ўніверсітэта. – Воп. 5.– № ЕГ/1.
2. Успаміны сына пра Міхаіла Фядотавіча Жаўрыда // Архіў сям'і М.Ф. Жаўрыда.

3. Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка: гісторыя і сучаснасць (1922–2002 гг.). – Мінск, 2002.
4. Загады, інструкцыі і інструктыўныя пісьмы Міністэрства вышэйшай адукацыі СССР, Міністэрства асветы БССР // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (далей НА РБ). – Фонд 1154. – Воп. 1. – Спр. 1.
5. Тамсама. – Спр. 17: Справаздача Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў аб рабоце за 1948–1949 вучэбны год.
6. Тамсама. – Спр. 109: Справаздача Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў аб рабоце за 1955–1956 вучэбны год.
7. Тамсама. – Спр. 125: Справаздача Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў аб рабоце за 1956–1957 вучэбны год.
8. Тамсама. – Спр. 160: Справаздача Мінскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута замежных моў аб рабоце за 1958–1959 вучэбны год.

*Поступила в редакцию 23.03.12*